Сачыненне

# Мая Радзіма – Беларусь

Ракач Яўгенія
ДУА «Сярэдняя школа № 12 г. Мінска», 5 «В» клас

Беларусь! Радзіма! Родны край! Мая любімая старонка! Для мяне Радзіма – гэта мае мама і тата, школа, мая настаўніца, людзі, якія мяне акружаюць. Побач з беларусамі жывуць у нашай краіне рускія, палякі, украінцы, літоўцы, яўрэі, татары, выхадцы з іншых краін. Усе мы – грамадзяне Рэспублікі Беларусь.

Чаму ж нас называюць беларусамі? Адны кажуць, што ад белага колеру льняной вопраткі і светлых валасоў нашых жыхароў. Ішыя сцвярджаюць, што белая – значыць вольная.

За што я люблю сваю Радзіму? За бацькоўскі дом, у якім я жыву. За маё шчаслівае дзяцінства, якое мне далі бацькі і наша дзяржава. За блакітнае і мірнае неба над галавой. За яснае і цёплае сонейка, якое саграваe сваімі промнямі наш край. Тут жывуць мае бабуля і дзядуля, якіх я вельмі люблю і дапамагаю ім.

Радзіма для мяне – гэта самы цудоўны падарунак лёсу, самае дарагое, што ў мяне ёсць. Я стаўлюся да тых людзей, для якіх пяняцце «Радзіма» – не проста слова.

Я лічу, што проста любіць і паважаць Радзіму – мала. Бо не словы ўпрагожваюць чалавека, а яго справы. І жыць трэба так, каб кожны дзень не праходзіў дарма.

Для кожнага чалавека Радзіма – гэта выключна ўнутраныя адчуванні. Гэта горад, у якім ты нарадзіўся, гэта вуліца, па якой ходзіш у школу, гэта парк з тваімі любімымі квітнеючымі каштанамі.

Радзіма – гэта, у першую чаргу, людзі. І я ганаруся хлопчыкамі і дзяўчынкамі, з якімі вучуся ў адным класе, бабулямі, якія выхоўваюць унукаў, лекарамі, што не адыходзяць ад хворых у рэанімацыйных палатах, настаўнікамі, лётчыкамі і шахцёрамі, рабочымі і студэнтамі.

Любоў да Радзімы – у кожным з нас. Яна ў нас з нараджэння, яна ў нас ад нашых бацькоў і дзядоў. Гэтая любоў - у кожнай матулінай маршчынцы пры яе ўсмешцы, у кожным поглядзе сябра.

Я разумею, што не проста даваць клятву Радзіме на вернасць да смерці. Але сваёй Радзіме я ніколі не здраджу, бо ганаруся тым, што нарадзілася ў Беларусі, у горадзе Мінску. Я вельмі люблю свой горад, мне дарагі кожны яго куточак. Я не магу ўявіць сваю Радзіму без яе цудоўных краявідаў, без маёй мовы, без меладычных песень маёй матулі. Мая «малая Радзіма» ўрасла каранямі ў сэрца, і адабраць яе можна толькі разам з жыццём.

Радзіма – месца, якое дае сілу жыць. Радзіма – месца, дзе паветра напоўняна энергіяй і святлом. Радзіма – месца, куды заўсёды цягне вярнуцца! Мы не выбіраем, дзе нарадзіцца. Дзе нарадзіўся – там і твая Радзіма!

Я вельмі люблю сваю краіну і ганаруся тым, што я беларусачка.

Жадаю ўсім дабрабыту і мірнага неба!